# З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ, СЯБРЫ!

## УЗНАГАРОДА — ГОНАР КАЛЕКТЫВУ

У час студэнцкіх канікул прыемныя весткі прыйшлі ва універсітэт: за вялікія заслугі ў развіцці вышэйшай адукацыі і падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі рэктару БДУ акадэміку Антону Нічыпаравічу **Сеўчанку** прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і залатога медаля «Серп і молат». Загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прафесар Васіль Іванавіч **Сцяпанаў** узнагароджан ордэнам «Кастрычніцкай Рэвалюцыі». Ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга ўзнагароджаны прарэктар БДУ прафесар Леанід Вікенцьевіч **Валадзько** і загадчык кафедры арганічнай хіміі Іван Рыгоравіч **Цішчанка**.

У ліку ўзнагароджаных ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга работнікаў друку, радыё і тэлебачання за поспехі ў выкананні пяцігадовага плана — дырэктар выдавецтва БДУ Людміла Аляксандраўна **Севасцьянчык**. Ордэн «Знак Пашаны» ўручан дэкану завочнага факультэта Таццяне Яфімаўне **Дударавай**; медалем «За працоўную доблесць» адзначаны заслугі сакратара парткома Міхаіла Кірылавіча **Гарбачова** і дыспетчара вучэбнай часткі Вольгі Кузьмінічны **Пазняк**.

Ад імя шматтысячнага студэнцкага калектыву горача віншуем узнагароджаных з высокай ацэнкай іх працы!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 24 (819) ● Серада, 1 верасня 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

## НА ПАРОЗЕ ЮБІЛЕЙНАГА

**Сёння мы ўступаем у новы навучальны год, які для ўсіх нас застанецца незабыўным. У кастрычніку нашаму роднаму універсітэту споўніцца 50 год. Прайшоўшыя паўвека яго гісторыі адзначаны вялікай працай некалькіх пакаленняў выкладчыкаў і студэнтаў, станаўленем навуковай сталасці, умацаваннем матэрыяльнай базы БДУ, дазволіўшай рыхтаваць па-сапраўднаму шырока адукаваных спецыялістаў.**

**Нараджэнне першага ў рэспубліцы універсітэцкага цэнтра паклала пачатак бурнаму росту нацыянальных кадраў у Беларусі. На яго аснове фарміраваліся і мацнелі ўсе вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі, створаныя ў даваенны перыяд: педагагічны, політэхнічны, медыцынскі інстытуты, інстытут народнай гаспадаркі.**

**Ва універсітэцкіх сценах былі закладзены асновы раду галін беларускай навукі. Тут атрымалі адукацыю і раскрылі свой талент выдатныя прадстаўнікі нашай літаратуры, мастацтва, культуры.**

**Юбілейны год — гэта не толькі вялікае свята, але і напружаная праца. І трэба зрабіць усё для таго, каб ён пакінуў прыкметны след ва універсітэцкай гісторыі і прынёс новыя поспехі ў падрыхтоўцы сапраўды сучасных спецыялістаў, загартаваных і стойкіх будаўнікоў камунізму.**

**Са святам, юныя сябры, дарагія калегі! За працу!**

**С. УМРЭЙКА,**
**член-карэспандэнт АПН СССР,**
**прарэктар БДУ.**

## ПАМНАЖАЦЬ ТРАДЫЦЫІ

**Дарагія першакурснікі! Сёння вы сталі студэнтамі, большасць з вас улілася ў нашу 10-тысячную камсамольскую арганізацыю. Знамянальным з'яўляецца тое, што папаўненне прыйшло напярэдадні 50-годдзя камсамоліі БДУ. Вам працягваць слаўныя традыцыі мінулых камсамольскіх год, вам вырашаць задачы, пастаўленыя XXIV з'ездам КПСС перад студэнтамі ў дзевятай пяцігодцы.**

**У 1921 годзе, адразу ж пасля адкрыцця універсітэта, на рабочым факультэце аформілася і камсамольская арганізацыя, якая складалася тады з некалькіх чалавек. І з тых далёкіх дзён яе дзейнасць была накіравана на выхаванне новай, рабоча-сялянскай, савецкай інтэлігенцыі, на здзяйсненне культурнай рэвалюцыі ў нашай рэспубліцы. Камсамольцы актыўна ўдзельнічалі ва ўсіх гаспадарчых і палітычных кампаніях, якія праходзілі ў краіне. Яны вытрымалі экзамен грамадскай сталасці, удзельнічаючы ў нядзельніках, аказваючы дапамогу галадаючым, ведучы барацьбу з дзіцячай безнагляднасцю, ліквідуючы непісьменнасць сярод насельніцтва, працуючы ў падшэфных вёсках. У 30-я гады камсамольская арганізацыя заклікала ўсіх студэнтаў упарта авалодваць ведамі з мэтай паляпшэння падрыхтоўкі кадраў інжынерна - тэхнічнай і навуковай інтэлігенцыі, умацоўваючы сувязі навуковых даследаванняў з патрабаваннямі сацыялістычнага будаўніцтва.**

**Суровую праверку на палітычную сталасць прайшла наша камсамольская арганізацыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Сотні яе выхаванцаў аддалі сваё жыццё ў барацьбе з фашызмам.**

**У пасляваенныя гады разам з вялікай работай па павышэнню пасняховасці і прыцягненню студэнтаў да навуковай работы наша камсамольская арганізацыя ўнесла вялікі ўклад у асваенне цалінных зямель і будаўніцтва ў аддаленых сельскіх раёнах БССР і краіны. Каля 2 000 байцоў**

*(Працяг на 3-й стар.).*

**Гэтыя хвалюючыя дні... Для абітурыентаў і экзаменатараў гэта была пара найвышэйшага напружання сіл, сканцэнтраванай і творчай работы. Не ўсе з тых, хто жадаў стаць студэнтам, дайшлі да запаветнага фінішу. І толькі самым падрыхтаваным поспех спадарожнічаў на кожным экзамене.**





*НА ЗДЫМКАХ: (справа) экзамен па гісторыі СССР прымаюць кандыдат юрыдычных навук М. Ф. СЦЯПАНКА і кандыдат гістарычных навук Ю. І. ДРАГУН; пішуць сачыненне абітурыенты філфака.*

Фота **Д. Чаховіча.**

## ЛЕТАПІС ФАКУЛЬТЭТА

**Міне менш двух месяцаў, і ўсе мы, увесь беларускі народ будзе адзначаць вялікае і знамянальнае свята — паўвекавы юбілей універсітэта. Кожны факультэт па-свойму рыхтуецца да гэтай даты. Фізікі вырашылі да юбілейных дзён стварыць выстаўку, якая б красамоўна расказала аб гісторыі і сённяшнім дні найвялікшага факультэта БДУ. На адным з паверхаў будынка фізічнага корпуса разгорнецца экспазіцыя з серыі планшэтаў.**

**Пётр Андрэевіч Бурынскі, заняты афармленнем сабранага матэрыялу, паказвае, што ўжо зроблена. І мы пераносімся на 50 год назад, да дня нараджэння універсітэта. Архіўныя фотаздымкі дазваляюць убачыць панараму будаўніцтва універсітэцкага гарадка, а словы «Акта ўрачыстай закладкі будынкаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта» дапамагаюць адчуць усю значнасць гэтага факту. У акце гаворыцца: «...У дзень вялікага свята 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі закладваецца першы будынак Беларускага універсітэцкага гарадка — галоўны яго аўдыторны корпус.**

**Няхай пабудова Беларускага універсітэцкага гарадка з'явіцца помнікам культурнага росту Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, выкліканага Вялікім Кастрычнікам...»**

**А далей даты, лічбы, фотаздымкі... Асобны, багата ілюстраваны аддзел пазнаёміць наведвальнікаў з сённяшнім днём факультэта, з яго разнастайным і паўнакроўным жыццём.**

**Работы па стварэнню выстаўкі яшчэ не завершаны, аднак, здаецца, фізікі зрабілі добрую заяўку.**

**А. АЛЕНІЧ.**

## СВЯТА ВЕДАЎ У БДУ

Зусім нядаўна ў нашай краіне нарадзілася яшчэ адна добрая традыцыя: па прапанове ЦК ВЛКСМ 1 верасня ў вну, сярэдніх навучальных установах, школах будзе праводзіцца свята ведаў. Горача падтрымалі гэтую ініцыятыву і ў нашым універсітэце. У першы дзень новага навучальнага года на ўсіх факультэтах, курсах адбудуцца агульныя ўрачыстыя сходы — сустрэнуцца аднакурснікі, падзеляцца ўражаннямі аб летніх канікулах, дэканы і выкладчыкі раскажуць аб тым, што чакае студэнтаў у новым навучальным годзе. Так будзе ў старшакурснікаў.

А для тых, хто ўпершыню прыйшоў ва універсітэт на правах студэнта, праграма свята больш шырокая. Першакурснікі запрашаюцца на ўрачыстасць у актавую залу галоўнага корпуса. Тут перад імі выступяць рэктар універсітэта акадэмік АН БССР А. Н. Сеўчанка, вядучыя выкладчыкі БДУ, выдатнікі вучобы, камсамольскія актывісты, байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Яны раскажуць аб слаўным пяцідзесяцігадовым шляху універсітэта, аб традыцыях, аб выдатным укладзе нашых вучоных у развіццё савецкай навукі.



Студэнцкі будаўнічы атрад «Лінгва»—атрад не зусім звычайны. У ім больш двух дзесяткаў байцоў і... ніводнага хлопца, толькі—дзяўчаты. Для многіх з іх трэці семестр-71 стаў першым працоўным хрышчэннем.

**НА ЗДЫМКУ:** камандзір атрада Валя Сімкова перад строем сваіх «цуда-волатаў».

Фота В. Жуна.

# КАМСАМОЛЬЦЫ— НА КАЛГАСНЫЯ ПАЛІ!

У кастрычніку 1971 года наш калектыў, увесь беларускі народ урачыста адзначыць 50-годдзе БДУ імя У. І. Леніна. Штодзённа вырашаючы практычна задачы камуністычнага будаўніцтва, вызначаныя на XXIV з'ездзе КПСС, студэнты вялікімі справамі і поспехамі сустракаюць юбілей.

Па традыцыі, працягваючы свой працоўны семестр, студэнты універсітэта ў верасні працуюць на палях калгасаў і саўгасаў, дапамагаючы працаўнікам сяла. У гэтым годзе палявыя работы ў вёсцы разгорнуцца ў перыяд I этапа Усесаюзнага Ленінскага заліку «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё». Гэты этап заканчваецца 29 кастрычніка 1971 года, у дзень нараджэння камсамола. Для нашай арганізацыі гэтая дата супадае з днём нараджэння нашага універсітэта.

У ходзе першага этапа камсамольскім арганізацыям неабходна прааналізаваць удзел кожнага члена ВЛКСМ у выкананні рашэнняў XXIV з'езда партыі. Кожнаму камсамольцу трэба скласці асабісты комплексны план «Вучыцца камунізму», які б найбольш поўна характарызаваў імкненне па-ленінску жыць, працаваць і змагацца, паўсядзённа выконваючы рашэнні партыі, актыўна займацца грамадскай работай. Выдатная і добрая вучоба — найпершы абавязак кожнага студэнта - камсамольца. Таму ЦК ВЛКСМ абавязвае камсамольскія арганізацыі вну распрацаваць і здзейсніць меры, накіраваныя на забеспячэнне выдатнай і добрай вучобы юнакоў і дзяўчат, на актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці. Камсамольскі і прафсаюзны камітэты універсітэта лічаць, што ўдзел студэнтаў у будаўнічых атрадах і ўборачных сельскагаспадарчых работах павінны ўнесці дастойны ўклад у працоўныя здзяйсненні нашага народа.

Разглядаючы сельскагаспадарчыя работы як важнейшую справу кожнага студэнта, з мэтай іх эфектыўнага правядзення і найлепшай арганізацыі ідэалагічнага выхавання ў кожнай студэнцкай групе ў гэты перыяд, камітэт камсамола і прафком універсітэта вырашылі аб'явіць у гонар 50-годдзя БДУ спаборніцтва на лепшую студэнцкую групу па выніках сельскагаспадарчых работ.

## УМОВЫ КОНКУРСУ

### I. ІДЭАЛАГІЧНАЯ РАБОТА

У час уборачных сельскагаспадарчых работ студэнцкая група павінна устанавіць дзелавы кантакт з калектывам рабочых і калгаснікаў, з мясцовай камсамольскай або прафсаюзнай арганізацыяй. Мяркуецца не толькі сумесная работа на палях, але і арганізацыя агульнымі сіламі вечароў канцэртаў мастацкай самадзейнасці, лекцый, гутарак і г. д. Усе мерапрыемствы павінны праводзіцца на аснове плана, выпрацаванага студэнцкай групай і мясцовай камсамольскай або прафсаюзнай арганізацыяй.

У пастанове бюро ЦК ВЛКСМ аб Усесаюзным Ленінскім заліку «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё» указваецца на неабходнасць удзяліць асаблівую ўвагу агульнаадукацыйнай вучобе камсамольцаў і моладзі, строга вызначыць задачы па аказанню дапамогі школе. Таму і ў час сельскагаспадарчых работ трэба прыняць удзел у абсталяванні ленінскіх пакояў, прадметных кабінетаў, спартыўных пляцовак, у выпуску насценгазет, арганізацыі мастацкай самадзейнасці, дапамагчы прафесіянальнай арыентацыі школьнікаў і г. д.

Студэнты павінны прачытаць лекцыі аб 50-годдзі БДУ, аб сваім факультэце, падзяліцца вопытам камсамольскай работы, дапамагчы арганізаваць вучобу камсамольскага актыву. Студэнцкая група абавязана прымаць актыўны ўдзел ва ўсіх суботніках, нядзельніках і іншых мерапрыемствах.

### II. ВЫТВОРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Штодзённае выкананне і перавыкананне нормы павінна быць правілам кожнага студэнта - камсамольца. Няхай на любым рабочым месцы ён будзе прыкладам у працы і захаванні тэхнікі бяспекі. Калі па нейчай віне работа арганізавана дрэнна, ёсць прастоі, студэнт павінен ставіць пытанне аб выпраўленні становішча перад кіраўніцтвам калгаса, саўгаса або прадпрыемства, перад кіраўніцтвам універсітэта. Павышэнне працоўнай актыўнасці моладзі, выхаванне сапраўдных камуністычных адносін да працы, павышэнне ролі камсамольцаў у паскарэнні навукова - тэхнічнага прагрэсу, у выхаванні эканоміі і беражлівасці — вось адна з галоўных задач Ленінскага заліку «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё».

### III. ДЫСЦЫПЛІНА

Сваімі адносінамі да працы, паводзінамі ў час адпачынку студэнты павінны быць прыкладам для акружаючых. Любое парушэнне працоўнай і бытавой дысцыпліны павінна быць строга асуджана ў групе, а па звароце ва універсітэт — у камсамольскай арганізацыі. Быць дастойным прадстаўніком савецкай інтэлігенцыі, высока несці званне савецкага студэнта — ад таго, як будуць выконвацца гэтыя патрабаванні кожным, залежыць поспех працы ўсёй групы, яе месца ў спаборніцтве.

### IV. СПРАВАЗДАЧНАСЦЬ І ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ

Пасля заканчэння работ кіраўнікі студэнцкіх груп прадстаўляюць да 15 кастрычніка 1971 г. у камітэты камсамола або прафбюро факультэтаў даведкі, завераныя кіраўніцтвам прадпрыемства. У даведцы, акрамя агульнай характарыстыкі работы, павінна быць указана:

— кошт выкананай работы, у тым ліку на аднаго чалавека;

— удзел у суботніках і нядзельніках;

— чытанне лекцый, правядзенне гутарак і канцэртаў;

— дапамога мясцовай школе;

— стан дысцыпліны ў групе.

Камітэты камсамола і прафбюро факультэтаў падводзяць папярэднія вынікі і прадстаўляюць да 1 лістапада ў камітэт камсамола або прафком універсітэта матэрыялы аб лепшай групе факультэта. Пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва ўзнагароджваюцца цікавымі экскурсійнымі паездкамі па краіне або каштоўнымі падарункамі.

КАМІТЭТ КАМСАМОЛА
ПРАФКОМ.

# ТРЭЦІ СЕМЕСТР: ДРУЖБА

**Інтэрнацыянальны атрад «Дружба» працаваў у БУ-105 трэста № 3 г. Салігорска. Працаваў 24 дні, асвоіў каля 35 тысяч рублёў. Былі здадзены жомавая яма і дзве 100-метровыя бетонныя паласы ў кароўніку. Гэтыя аб'екты ўваходзяць у жывёлаводчы комплекс, які будуецца на Случчыне ў саўгасе «Белічы». Атрадам камандаваў Алег Мельнікаў, аспірант БДУ, камісар — Уладзімір Гірэнка (юрфак, 3 курс). Колькасць—36 чалавек, з іх 22—нямецкія студэнты з Іенскага універсітэта імя Фрыдрыха Шылера. Прапануем вашай увазе старонкі з дзённіка байца атрада, студэнта факультэта журналістыкі А. МІХАЛЬЧАНКІ.**

Трыццаціградусная спякота, без ветру... У пажаўцеўшай траве стракочуць конікі. А ў небе ні воблачка!

Над катлаванам раздаецца крык камісара Валодзі Гірэнкі: «Бетон ідзе!» Воблака пылу, якое рухаецца ў напрамку да нас, пацвярджае зоркасць Валодзі. Бетоншчыкі рыхтуюцца сустрэць машыну «як належыць». Разбіраюцца лапаты, ламы, перасоўваюцца вялізныя скрыні.

Першая машына, цяжка вуркочучы, ужо пад'язджае. Шафёр, высунуўшыся з кабіны, пытае: «Куды?». Саша Сабалеўская, Раланд Шпетэр, Тамара Вакіна і Інга Рэйнман заварочваюць аўтамабіль да сябе на адкос.

Раланд, хапаючы лапатай як можна больш, перакідвае бетон са скрыні на адкос. Унізе Гуннар і Карл-Хайнц даводзяць яго да «кандыцыі», раўняючы дошкай. Нашы дзяўчаты Саша, Інга, Тамара не адстаюць. Жывы канвеер не спыніцца да апошняй мінуты, пакуль не зробяць прыгладку, пасля якой, па словах нашых сяброў, атрымліваецца «бетон-элегант».

Навокал нічога не стаіць на месцы. Проста на вачах растуць адкосы і сцяна. А сонца прыпякае. Цэмент застывае зусім хутка: мінута і тая дарагая! Сям-там трэба было б крыху вады для давядзення бетону да «элегантнага» становішча, але вады не хапае. Выйсце знаходзіць Вернер Нагель: змахнуўшы на бетон пот з ілба, ён прапаноўвае таварышам зрабіць тое ж.

— Так будзе мацней!— усміхаецца вясёлы першакурснік.

У кароўніку ў гэты час прыемны халадок. Брыгада Барбары Бетхер занята на бетаніраванні 100-метровых палос, устаноўцы апалубкі і планіроўцы грунту. Людзі ў брыгадзе падабраліся вопытныя. Барбара і яе муж Петэр не першы раз у СССР на студэнцкай будоўлі. Два гады назад у Наваполацку яны сталі бетоншчыкамі. І добра прыгледзеліся адзін да другога. У выніку — праз год вяселле, а праз два— зноў у Беларусь. Астатнія члены брыгады упершыню прыехалі за мяжу.

Манфрэд Бакес, Гергард Рытсхельд, Рольф Вітэрфільд — студэнты матэматычнага факультэта, але тут яны працуюць не толькі галавой, але і рукамі. Хлопцы ўжо ўдзельнічалі ў студэнцкім руху ў сябе на радзіме, арганізаваным Саюзам свабоднай нямецкай моладзі. Вопыт ёсць, але новыя ўмовы патрабуюць новых рашэнняў. Таму любое складанае заданне майстра выклікае маленькую вытворчую нараду. Петэр Бетхер, перш чым прыступіць да работы, старанна ўсё абдумвае. Сёння вырашана весці планіроўку грунту і прыём бетону адначасова. Усе без выключэння згаджаюцца з Петэрам: перспектыва ў працы — гэта добра.

І вось вынікі дня: план выканан атрадам на 154 працэнты.

Ёсць прымаўка аб тым, што чалавека можна пазнаць, з'еўшы разам пуд солі. Мы яшчэ не з'елі столькі, але, праліўшы ў працы «пуды» поту, добра разабраліся, «хто і чаго варты». Калісьці Вальтэр сказаў: «Вочы дружбы не памыляюцца». Па-мойму, правільна. Відаць, што побач з намі сапраўдныя і простыя людзі, прыехаўшыя вучыцца будаваць сацыялізм у краіны, якая будуе камунізм.

А. МІХАЛЬЧАНКА.

# Конкурс рацыяналізатараў





# ВЫПРАБАВАННЕ ПРАЦАЙ

Для адных трэці працоўных семестр заканчваецца летам, а для іншых прыходзіць у верасні дружнай і цікавай паездкай «на бульбу». Для студэнтаў-філолагаў мінулагодняя «бульба» стала асабліва памятнай падзеяй. А пачалося ўсё з агульнага сходу, абмеркавання ўмоў сацыялістычнага спаборніцтва на лепшую групу ў трэцім працоўным і рашэння дабіцца звання лепшых. І вось 32 групы студэнтаў - філолагаў выехалі ў калгасы Уздзенскага раёна Мінскай вобласці. Якая ж з іх стане лепшай на факультэце, а можа і ва універсітэце?

З асаблівым энтузіязмам прыняліся за працу першакурснікі. Для іх гэта не проста працоўны, а першы ў студэнцкім жыцці працоўны. І ў выніку—выдатныя поспехі. Асабліва добра папрацавала І група І курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры. Дружныя падабраліся рабяты, баявы ў іх камсорг Рая Антаненка, уважлівы куратар камуніст І. В. Шадурскі. 330 тон бульбы выкапалі студэнты гэтай групы за 20 дзён работы. З павагай гаварылі пра іх калгаснікі, а ў раённай газеце «Чырвоная зорка» з'явілася заметка аб ударнай працы студэнтаў-філолагаў.

Вечарамі збіраліся студэнты ў клубе, выпускалі баявыя лісткі і газеты, рыхтаваліся адзначыць вялікае свята — 50-годдзе беларускай камсамоліі. Надоўга запомняць у калгасе «Інтэрнацыянал» 24 верасня 1970 года. З вялікім уздымам працавалі рабяты днём у полі, а вечарам у клубе выступілі перад калгаснікамі: расказалі аб універсітэце, сваімі сіламі далі канцэрт.

А калі ва універсітэце падвялі вынікі сацыялістычнага спаборніцтва, то аказалася, што гэта група заняла першае месца ў БДУ. А пасля была цікавая паездка ў Брэст — заслужаная ўзнагарода пераможцу сацыялістычнага спаборніцтва.

Прайшоў год, рабят зноў чакаюць вераснёўскія палі. Па-баявому настроена група ў дні падрыхтоўкі да новага працоўнага семестра.

І. РАБЧЫНСКАЯ,
сакратар камітэта камсамола філфака.

# ПАМНАЖАЦЬ ТРАДЫЦЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

студэнцкіх будаўнічых атрадаў і ў гэтым годзе паспяхова завяршылі працоўны семестр. Працоўнае выхаванне стала магутным рычагом ідэалагічнай работы камітэта камсамола.

Шматграннай стала шэфская работа студэнтаў на прадпрыемствах, у калгасах, воінскіх часцях і асабліва ў сельскіх і гарадскіх сярэдніх школах. Студэнты-камсамольцы выступаюць з лекцыямі і дакладамі, кан[...]тамі мастацкай сама[...]асці, папаўняюць біб[...]ятэкі сабранымі ў сябе кнігамі, арганізуюць алімпіяды, канферэнцыі чытачоў, вечары адпачынку, экскурсіі, спартыўныя паядынкі, дапамагаюць афармляць стэнды нагляднай агітацыі, рыхтуюць моладзь да паступлення ў вну і г. д.

Камсамольская арганізацыя не ўпускае з поля зроку і культурна-масавую работу, якая з'яўляецца састаўной часткай камуністычнага выхавання моладзі. На кожным факультэце ёсць свае агітбрыгады, плённа працуюць універсітэцкія калектывы мастацкай самадзейнасці, тром з якіх было прысвоена высокае званне народных: харавая капэла, ансамбль танца «Крыжачок», аркестр народных інструментаў.

Неад'емнай часткай камсамольскага жыцця стала спартыўна - масавая работа. Дзейнічаюць секцыі па большасці відаў спорту, сотні ўдзельнікаў прыцягвае круглагадавая спартакіяда, нашы студэнты з'яўляюцца членамі зборных каманд рэспублікі, ведамстваў і СССР. У цесным кантакце з камітэтам камсамола працуе арганізацыя ДТСААФ, за апошнія гады вялікіх поспехаў дабіліся мы ў ваенна-патрыятычнай рабоце.

Значна ўзмацнеў наш факультэт грамадскіх прафесій, створаны ў 1965 годзе. На шасці яго аддзяленнях (харэаграфічным, рэжысёрскім, хормайстарскім, лектарскім, піянерважатых, суддзяў і інструктараў па спорце) штогод сотні студэнтаў пашыраюць сваю эрудыцыю і атрымліваюць навыкі арганізатарскай работы.

Вялікай падзеяй у жыцці універсітэцкай моладзі з'явіўся Усесаюзны Ленінскі залік. На камсамольскіх сходах у групах, на патоках і курсах адбылася вялікая размова аб ролі камсамола вну, павышэнні актыўнасці і баявітасці, фарміраванні светапогляду, аб адносінах да абывацельскага настрою.

Вы, дарагія першакурснікі, сталі нашымі калегамі ў перыяд Усесаюзнага Ленінскага заліку «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё». Вам выконваць задачы, дакладна сфармуляваныя ў пастанове бюро ЦК ВЛКСМ аб правядзенні Ленінскага заліку. На I этапе яго пасля стварэння ў групах, на патоках і курсах камсамольскіх арганізацый неабходна да 1 кастрычніка кожнаму камсамольцу скласці асабісты план «Вучыцца камунізму», які будзе характарызаваць імкненне па-ленінску жыць, працаваць і вучыцца, паўсядзённа выконваць рашэнні партыі, актыўна займацца грамадскай работай.

Камсамольскія бюро груп, патокаў і курсаў павінны ў кантакце з выкладчыкамі распрацаваць меры, накіраваныя на забеспячэнне выдатнай і добрай вучобы юнакоў і дзяўчат, на прыцягненне іх да актыўнага ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці, да працы на карысць Радзімы.

За паўстагоддзя свайго існавання універсітэцкі камсамол праявіў уменне і баявы энтузіязм у рашэнні тых задач, якія ставілі перад вну краіны партыя і ўрад. Яго гонарам з'яўляюцца каля 30 тысяч спецыялістаў— выпускнікоў універсітэта. Мы ганарымся тым, што ў сувязі з 50-годдзем ЛКСМБ камсамольская арганізацыя БДУ ўзнагароджана Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета БССР. Але рашэнне тых складаных і адказных задач, якія стаяць перад камсамолам вну, у вялікай ступені ў вашых руках, першакурснікі! Прыміце шчырыя віншаванні з пачаткам вашага студэнцкага жыцця!

**В. ПРАКОШЫН,**
сакратар камітэта камсамола БДУ.



**У гэты адказны момант толькі выбраная тэма сачынення займае думкі абітурыентаў. У некалькіх спісаных лістах адлюструюцца іх веды, вопыт, светапогляд, а, можа, і мары.**

Фота **Д. Чаховіча.**

## СТАРОНКА ПЕРШАКУРСНІКА

# ПРЫМАЙ ЭСТАФЕТУ!

Прайшлі ўступныя экзамены, хваляванні, 10 бяссонных начэй. Адвечнае пытанне: быць ці не быць? — для цябе вырашана станоўча — быць! Ты атрымаў права називацца студэнтам, а гэта значыць быць на пярэднім краі барацьбы за веды. Наперадзе чакаюць лекцыі, семінары, лабараторныя работы, удзел у грамадскім жыцці універсітэта, заняткі спортам і многа іншых цікавых спраў. Масцітыя прафесары, выкладчыкі, лабаранты універсітэта павядуць цябе па крутых сцежках навуковых ведаў, раскрыюць тайны сваіх прафесій.

Грамадскія арганізацыі прапануюць свае планы палітыка-выхаваўчай, культурна-масавай і спартыўнай работы. Ставіцца галоўная задача: за пяць вучэбных год авалодаць сакрэтамі выбранай прафесіі з улікам патрабаванняў сучаснай вытворчасці, навукі, тэхнікі, культуры і перспектыў іх развіцця, глыбока вывучыць марксісцка-ленінскую тэорыю, набыць навыкі арганізацыі палітыка - выхаваўчай, культурна-масавай работы сярод насельніцтва. Гэта складаная задача. Яна акажацца пад сілу толькі тым юнакам і дзяўчатам, хто з першых дзён навучальнага года і да дзяржаўнага экзамена правіць волю, настойлівасць у яе вырашэнні. Я не адкрыю новай Амерыкі, калі скажу, што шлях да поспеху ляжыць праз паўсядзённую клапатлівую працу кожнага студэнта. Але праца гэтая не з'яўляецца абцяжарваючай, таму што пошук ведаў праходзіць з вялікай цікавасцю, захоплівае сваёй рамантыкай.

Сістэматычнасць у накапленні ведаў адыгрывае важнейшую ролю ў якаснай падрыхтоўцы маладога спецыяліста. Рэгулярнае наведванне лекцый, вядзенне канспектыўных запісаў праслуханага на іх стане асноўным даведнікам у лабірынтах кніжнага акіяна. Своечасова заканспектаваная першакрыніца, выкананыя лабараторныя заданні дапамогуць сістэматычна «быць пры ведах», актыўна выступаць на семінарскіх занятках, удзельнічаць у студэнцкіх дыскусіях.

Набываючы акадэмічныя веды, выпрацаваныя чалавецтвам у мінулым, нельга упускаць сённяшні дзень. Прасачыць за пульсам сучаснай навуковай думкі можна праз сістэматычнае чытанне навуковых часопісаў, газет, спецыяльнай навуковай літаратуры. Паспрабаваць свае сілы на навуковай ніве дапаможа студэнцкае навуковае таварыства, у якое абавязкова трэба уступіць з першых дзён вучобы.

Усебаковае гарманічнае развіццё маладога чалавека прадугледжвае абавязковыя заняткі спортам, удзел у жыцці грамадскіх арганізацый універсітэта. Перад вамі будзе адкрыт «шырокі асартымент» разнастайных спартыўных секцый, масава-палітычных гурткоў, розных культурна-масавых мерапрыемстваў.

Хачу перасцерагчы навічкоў — не запісвайцеся ва ўсе секцыі, гурткі, якія вам прапануюць, не бяжыце па першай трапіўшай аб'яве. Добра абдумайце прапанаванае вам, узважце свае здольнасці, не забудзьце пры гэтым на першае месца паставіць непасрэдную вучэбную праграму і тады толькі вырашайце. Знаходзяцца і такія студэнты, якія пераацэньваюць свае сілы, стараюцца ахапіць бязмежнае. На першай жа экзаменацыйнай сесіі яны паказваюць сваю павярхоўную падрыхтоўку, губляюць баявы дух, кідаюцца ў паніку. Некаторыя студэнты, наадварот, недаацэньваюць свае сілы. Акрамя вучобы, іх нішто не прыцягвае, яны свядома абмяжоўваюць свой светапогляд. Студэнцкае жыццё для іх праходзіць у «муках зубрэння», нічога светлага з яго яны не выносяць.

Вельмі важна правільна размеркаваць свой час, сілы, каб вучыцца на добра і выдатна, а таксама паспяваць займацца спортам, хадзіць у тэатр, кіно і г. д. Неабходнасць удзелу ў грамадскім жыцці універсітэта бясспрэчная, таму што ў ёй студэнт пашырае свой кругагляд, знаходзіць падтрымку і дапамогу з боку таварышаў, грамадскіх арганізацый. За парадай, дапамогай трэба часцей звяртацца таксама да ўмудроных вопытам выкладчыкаў, лабарантаў, а таксама да сваіх старшакурснікаў. Свой першы навучальны год вы пачынаеце ў знамянальныя дні падрыхтоўкі да юбілейнага свята універсітэта. Гэта цяпер і ваша свята. Няхай жа ўсе гады вучобы ў нашым універсітэце вам назаўсёды стануць самым светлым святам у жыцці.

**Л. ДАВЫДЗЕНКА,**
**студэнт V курса гістфака, ленінскі стыпендыят.**

# ВАС ЧАКАЮЦЬ КНІГІ

Дарагія першакурснікі! З гэтага часу вы студэнты. І, вядома, вы не можаце абысціся без кніг. З ранняга ўзросту да апошніх дзён сваіх карыстаемся мы імі як невычэрпнай крыніцай ведаў, як бязмежным акіянам чалавечай мудрасці.

Наша бібліятэка налічвае каля мільёна тамоў. Яе фонд укамплектаван самай разнастайнай літаратурай: грамадска - палітычнай, вучэбнай, навуковай, мастацкай і г. д.

Бібліятэка абслугоўвае сваіх чытачоў на абанеменце, у чытальных залах, у даведніцка-бібліяграфічным аддзеле, у філіяле юрфака, у кабінетах гістарычнага, філалагічнага, геаграфічнага, юрыдычнага факультэтаў і факультэта журналістыкі, на кафедрах грамадскіх навук і ў іншых пунктах абслугоўвання. Усе яны звязаны адзін з другім і аб'ядноўваюцца ў адзінае цэлае — фундаментальную бібліятэку універсітэта.

Каб стаць чытачом нашай бібліятэкі, г. зн. атрымаць права карыстацца кніжным фондам, неабходна запісацца ў дзяжурнага бібліятэкара, прад'явіўшы свой студэнцкі білет. Пры запісе ў бібліятэку чытачы атрымліваюць адзіны білет чытача, які дае права карыстацца літаратурай ва ўсіх пунктах выдачы.

Дамашні абанемент размешчан на другім паверсе. Тут выдаюцца кнігі на дом. Студэнт павінен беражна захоўваць кнігі і іншыя друкаваныя выданні, выдадзеныя яму бібліятэкай. Нельга падкрэсліваць тэкст, рабіць паметкі, перагібаць старонкі, вырываць лісты. Нельга затрымліваць больш належачага тэрміну ўзятыя дадому бібліятэчныя кнігі. Трэба пастарацца вярнуць іх датэрмінова, бо на іх разлічваюць іншыя студэнты. У выпадку страты кнігі трэба вярнуць бібліятэцы раўнацэнныя выданні або замяніць убытак ва ўстаноўленым бібліятэкай парадку, не чакаючы напамінання і папярэджання.

Студэнцкія чытальныя залы размешчаны на другім і трэцім паверхах галоўнага корпуса.

У чытальнай зале арганізаван адкрыты доступ да фонду. Гэта дазваляе студэнтам непасрэдна ля кніжнай паліцы пазнаёміцца з літаратурай. Кожны студэнт павінен падтрымліваць у чытальных залах парадак і цішыню, дзелавую працоўную атмасферу, не перашэптвацца з таварышам па ўзнікшых пытаннях — іх лепш абмеркаваць у фае, — чытаць не ўголас, а пра сябе, не перашкаджаючы тым, хто сядзіць побач. Кнігі з чытальнай залы студэнт павінен здаць дзяжурнаму бібліятэкару. Нельга выносіць кнігі з чытальнай залы, браць іх дадому: яны патрэбны іншым студэнтам, вашым таварышам.

На другім паверсе (уваход праз чытальную залу № 2) размяшчаецца даведніцка - бібліяграфічны аддзел, у наяўнасці якога вялікі фонд даведніцкай літаратуры, сістэматычны каталог і шэраг тэматычных картатэк. Тут можна атрымаць бібліяграфічную даведку.

Для азнаямлення з фондам бібліятэкі, працай чытальных залаў, даведніцка - бібліяграфічным апаратам са студэнтамі першых курсаў праводзяцца экскурсіі. Па аўторках арганізуецца адкрыты прагляд літаратуры, паступіўшай у бібліятэку за тыдзень. Для раскрыцця зместу фонду ёсць алфавітны і сістэматычны каталогі. Алфавітны — 3-ці паверх, пакой № 319, сістэматычны — 2-гі паверх, пакой № 223.

Бібліятэка універсітэта праводзіць цікавую і разнастайную работу з кнігай: дыспуты, канферэнцыі чытачоў, літаратурныя вечары, агляды навінак літаратуры і г. д. Просім вас не быць у баку ад усіх нашых мерапрыемстваў, а ўключыцца ў работу разам з намі.

**Л. МІЦКЕВІЧ.**

← ПАРАДЫ БІБЛІЯТЭКАРА



ПАРАДЫ УРАЧА

# БЕРАЖЫЦЕ ЗДАРОЎЕ І ЧАС

Вучоба ва універсітэце патрабуе ад вас вялікага напружання сіл. Перш за ўсё давядзецца змяніць свой стары прывычны ўклад жыцця. На гэта пойдзе нямала нервовай энергіі і часу. Для таго, каб гэтая перабудова не адбілася адмоўна на стане здароўя, неабходна правільна скласці рэжым дня, рацыянальна размеркаваць свой час. У гэтым залог прадукцыйнасці вучобы першакурсніка.

Неабходна чаргаваць вучобу з адпачынкам, з фізічнай працай, з заняткамі фізкультурай і спортам. Дастатковым павінен быць начны сон — не менш 8 гадзін. Не менш 2 гадзін трэба бываць на свежым паветры.

Неабходна правільна арганізаваць культурны адпачынак: наведваць кіно, тэатры, музеі, вечары.

Прыкладны рэжым дня:

7.00—пад'ём, праветрыванне пакоя.

7.15 — гігіенічная гімнастыка, ранішні туалет.

7.45 — 8.10 — снеданне.

8.30 — 14.00—заняткі ва універсітэце.

14.00—15.00—абед.

15.00 — 16.00—дзённы адпачынак (прагулка).

16.00 — 19.00 — самастойныя дамашнія заняткі.

19.00—19.30 — вячэра.

19.30 — 23.00—дамашнія заняткі, прагулка перад сном.

23.00—7.00 — сон.

Строга трэба падтрымліваць рэжым харчавання, прымаць страву ў вызначаны час і ў патрэбным асартыменце. Абавязкова паснедаць дома, пасля заняткаў павінен быць гарачы абед і вечарам — вячэра.

Неабходна падтрымліваць асабістую гігіену, сачыць за чысцінёй скуры, валос. Вельмі важна падтрымліваць чысціню ў жылым памяшканні. У інтэрнаце нельга курыць у пакоі, нельга загрувашчваць шкафы і антрасолі непатрэбнымі рэчамі.

Своечасова трэба звяртацца да ўрача на агляд, на прафілактычныя прывіўкі, для лячэння.

Усім першакурснікам неабходна прадставіць даведкі аб раней праведзеных па месцы жыхарства прывіўках, каб не прыйшлося іх паўтараць.

Жадаем вам добрага здароўя, выдатнай вучобы!

**Ф. РЭЗНІКАВА,**
**урач.**

